Л.В. Леванцэвіч (Брэст, БрДУ)

Даследаванне фразеалогіі мовы Брэсцка-Пінскага Палесся

Вывучэнне асаблівасцей мовы гаворак Брэсцка-Пінскага Палесся пачалося яшчэ ў XIX ст. і працягваецца па сённяшні дзень. Даследаванне вядзецца на розных напрамках: ад слоўнікавых падборак да тэарэтычнага асэнсавання моўных з'яў. У асноўным гэта асобныя артыкулы па пэўных галінах мовазнаўства. Большасць артыкулаў змяшчае матэрыял па анамастыцы, лексіцы, фанетыцы. У нешматлікіх артыкулах закранаюцца пытанні дыялектнай марфалогіі, этналінгвістыкі. Апублікаваны лінгвагеаграфічныя рэгіянальныя атласы гаворак Бярозаўскага, Івацэвіцкага і Пружанскага раёнаў. Сістэмнае вывучэнне лексікі гаворак Брэстчыны пачалося напрыканцы 80-х гадоў XX ст. Першай лексікаграфічнай працай стаў "Дыялектны слоўнік Брэстчыны" (1989), пазней пачалі з'яўляцца слоўнікі па гаворцы асобнай вёскі (С.С. Клундук, М.І. Пашкевіч, В.М. Касцючык і інш.). У апошнім дзесяцігоддзі XX ст. на пачатку XXI ст. пачалі з'яўляцца артыкулы па дыялектнай фразеалогіі. Збіранне, навуковае апісанне і публікацыя слоўнікаў дыялектных фразеалагізмаў былі і застаюцца вельмі важным даследаваннем фразеалагічных адзінак. Агляд прац па народнай фразеалогіі Брэсцка-Пінскага Палесся праведзены на пачатку 90-х гадоў у артыкулах "Устойлівыя адзінкі Брэсцка-Пінскага Палесся ў агульнамоўным кантэксце" (М.М. Аляхновіч) і "Лексіка і фразеалогія брэсцка-пінскіх гаворак у навуковых даследаваннях" (М.М. Аляхновіч, Т.М. Кананенка).

У артыкуле "У фразеалагічны слоўнік Брэстчыны" (Л.Г. Аляксейчык, У.У. Барысюк) пададзены прыказкі з вёскі Новая Папіна Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. Сярод прыказак няма арыгінальных мясцовых адзінак. Бальшасць з іх агульнавядомыя, занатаваныя ў слоўніках беларускіх прыказак (*Шеб знав, дэ упаду, то соломы подослав бы. Бырыжоного бог бырыжэ. Правда гочы колыть* і інш.), а таксама агульнавядомыя рускія прыказкі, пададзеныя ў мясцовым вымаўленні: *Солов'я баснямы ны кормять. Тішэ йідыш, дальшый будыш. У тісноті да ны в обіде*.

Адметныя фразеалагічныя адзінкі падаюцца ў артыкуле "З гаворкі вескі Альшаны Столінскага раена" (У.У. Барысюк, Н.М. Буян): *калюгі змераць* 'набраць у боты вады', *найшоў Ханя Маню* 'пра падобных людзей', *пыд бэрэзы пойці* 'памерці', *шыць-беліць – узаўтра велікдзень* 'работы многа, а часу мала'. Арыгінальнымі, самабытнымі з'яўляюцца ўстойлівыя адзінкі, узнікненне якіх звязана з канкрэтнымі жыхарамі вёскі: *заробіць, бы Броцкі на мыле* 'Вяскоўцы перадаюць з пакалення ў пакаленне, што колісь, яшчэ, як кажуць, пры паляках, быў такі чалавек з вёскі Кашары Броцкі, які таргаваў мылам і прагарэў на гэтай справе. Значэнне фразеалагізма – пратаргавацца'.

Невялікая частка фразеалогіі Брэсцка-Пінскага Палесся апублікавана ў "Дыялектным слоўніку Брэстчыны" (1989). Матэрыял пад загалоўкам "З фразеалогіі Брэстчыны" падрыхтавалі В.М. Емельяновіч і І.У. Сацута.

Унікальнасцю, непаўторнасцю вылучаюцца фразеалагізмы, у якіх выражаецца народная ацэнка жыцця, якія адлюстроўваюць умовы жыцця народа, яго гісторыю, культуру, геаграфію: *Антошчына робота* ‘пра дрэнна выкананую справу’; *бусько рэпу насее* 1) ‘пра вельмі бруднага’, 2) ’пра вельмі чыстага’, *всыпаты в рукав попылу* ‘спаліць, падпаліць што-небудзь’, *пойты в хвоіну* ‘памерці’, *плесці верэньку* ‘хлусіць’, *з торбыё пустыты* ‘зрабіць жабраком’.

Тэарэтычнае асвятленне сэнсава-сістэмных сувязей у фразеалогіі праводзіць у сваіх артыкулах М.М. Аляхновіч. Аўтар адзначае, што сэнсава-сістэмныя адносіны ў сферы дыялектнай фразеалогіі маюць і падобныя рысы і шмат адрозных ад фразеалогіі літаратурнай мовы-нормы.

Аналізам варыянтнасці, сінанімічнасці, антанімічнасці, мнагазначнасці, спалучальнасці ў народнай фразеалогіі займаецца В.М. Касцючык. У артыкуле “Рэгіянальныя асаблівасці фразеалагізмаў Брэсцка-Пінскага Палесся В.М. Касцючык вылучае наступныя тыпы фразеалагічных варыянтаў: фанетычныя (*вурваньська вулыця – вурваньська гулыця*), акцэнтныя (*як на го́лках – як на голка́х*), лексіка-кампанентныя (*одным шнурком – однэю выровкою*), марфалагічныя (*як в полы вітёр – як вітёр в полю*), сінтаксічныя (*чырыз бік вылызты – боком вылызты*), камбінаваныя (*калы́ту встыпынуты – встыпынуты калы́ткою*).

З’яву варыянтнасці як у асобнай гаворцы, так і паміж групай гаворак разглядае В.М. Касцючык у артыкулах “З назіранняў над міждыялектнай варыянтнасцю ФА”, “Пра адзін тып вар’іравання фразеалагізмаў у гаворках Берасцейшыны” і “Варыянтнасць у дыялектнай фразеалогіі (На аснове гаворак беларуска-ўкраінскага памежжа)”. Шматлікімі і разнастайнымі ў дыялектнай мове Брэстчыны з’яўляюцца словаўтваральныя варыянты: маюць розныя суфіксы (*бычкова кашка – бычеча кашка* ‘малодзіва’), прыстаўкі (*роспусціць кізі – попусціць кізі* ‘расплакацца’). Нярэдка дзеяслоўныя кампаненты з’яўляюцца словаўтваральнымі архаізмамі: *попусціць* (*попусціць кізі*), *пубываты* (*побываты порогы*), *постаты* (*нога ны постанэ*).

Аналізуючы семантычна тоесныя фразеалагічныя сінонімы, В.М. Касцючык прыходзіць да высновы, што семантычную тоеснасць фразеалагічных сінонімаў абумоўліваюць розныя фактары: для вобразных ФА – гэта аднаструктурнасць, аднолькавы шлях фразеаўтварэння, значная блізкасць вобразных асноў; для бязвобразных ці з аслабленай вобразнасцю – семантычная ці паняційная блізкасць слоў-кампанентаў, іх абстрактная семантыка, нейтралізацыя індывідуальных семантычных асаблівасцяў кампанентаў. У большасці сінанімічных радоў названыя прыкметы ўзаемазвязаныя.

У 2013 годзе выйшлі з друку матэрыялы для рэгіянальнага слоўніка “Сказана – звязана”, падрыхтаваныя В,М, Касцючык. У слоўніку зафіксавана лексіка і фразеалогія гаворкі, якой карыстаюцца жыхары вёскі Заазерная Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці. Фразеалагізмы пададзены ў раздзеле “Фразеалагічны слоўнік”. Фразеалагічныя адзінкі прыводзяцца ў алфавітным парадку, акрамя тлумачэння значэння ўстойлівай адзінкі, падаюцца

граматычныя і стылістычныя паметы. Прыфраземныя словы (словы-суправаджальнікі), без якіх фразеалагізм не рэалізуецца ў маўленні, падаюцца ў круглых дужках пасля фразеалагізма на дыялектнай мове:

на пырыспыхы́ (побігчы). Даганяючы каго-н. *Побігла на пырыспыхы, вдогонку за йім.*

Стылістычныя паметы ставяцца ўслед за граматычнымі, экспрэсіўна-ацэначная афарбоўку адзначаецца адпаведнай паметай: *неадабр., асудж., іран., жарт.*: дохвати́тыся як кум до дыты́ны, *неадабр*. Зрабіць неабачлівы, неабдуманы, неасцярожны ўчынак. *Вжэ опыкла руку. Дохватылася як кум до дытыны*; ёлопа ловыты, *іран*. Быць няспрытным, непаваротлівым; прапускаць зручны момант. *Чого ты ёлупа ловыш? Хутэнько йідь за ею*.

У слоўніку большая частка фразеалагізмаў мае мясцовы, рэгіянальны характар: яны не апісваліся ні ў нарматыўных слоўніках беларускай мовы, ні ў даведніках беларускай народна-дыялектнай фразеалогіі, ні ў асобных публікацыях: до́лыйкы затына́ты ‘*плакаць, скардзіцца, жаліцца*’; дво́е збо́ку ‘*знаходлівы, лоўкі ў сваіх учынках чалавек’*; з пэ́чы на пры́пык ‘*нікуды (не паехаць)*’; лопа́тку помочы́ты ‘*выпіць спіртнога’*; на мі́ры стое́ты ‘*не расці, не павялічвацца ў памерах*’ і інш.

У дыялектным слоўніку С.С. Клундук “Слова да слова – будзе мова : дыялектны слоўнік в. Фядоры” змешчаны і падборкі ўстойлівых адзінак: “Прыказкі і прымаўкі” (*Злодэя ключ шукае; Гны, покуля гнэцца; Шо ны край, то свій бай*), “Народныя прыкметы. Парады-засцярогі, зычэнні-засцярогі” (*В лісы ны пырыступай чэрэз повалэнэ дэрэво, бо заблудысса; Каравая наражвають тылькі нызамужніі дывкі*), “З мора вады не выбераш, з мовы слова не выкінеш… (фразеалагічныя адзінкі)”: *городыты языком* ‘абы-што гаварыць’, *дэ в чорта* ‘далёка’, *шо остопок* ‘вельмі вялікі’, *стэчы до всёго* ‘здатны, здольны’.

У слоўнік М.І. Пашкевіча “Рубельскі лексіка-фразеалагічны слоўнік” (2008) уключана 940 слоў і 195 фразеалагізмаў, якімі карыстаюцца жыхары вёскі Рубель Столінскага раёна. Слоўнік – спроба захаваць адметны пласт рубельскай лексікі, зберагчы фразеалагізмы, што выяўляюць назіральнасць, дасціпнасць, мудрасць вяскоўцаў.

Сярод фразеалагічных адзінак ёсць нямала арыгінальных, не зафіксаваных фразеалагічнымі даведнікамі (*быць у быва́лцах* ‘(пабываць) у складаных жыццёвых сітуацыях’, *іці на ко́зыр* ‘не лічыцца з чыёй-небудзь думкай; паказваць сваю перавагу’, *капо́рэ вонэ́* ‘выраз, які ўжываецца, калі размова ідзе пра нешта неістотнае, не самае важнае’, *з гуздро́м понесці́* ‘скрасці ўсё’, *зы́зуб стаць* ‘заўпарціцца, не слухацца’). Фразеалагізмы падаюцца без граматычных і стылістычных памет, у слоўнікавым артыкуле апісваецца значэнне фразеалагізма і прыводзіцца ілюстрацыйны матэрыял: гледзе́ць свое́ па́ршы. Не ўмешвацца ў чые-небудзь справы, не павучаць каго-небудзь. *Я кажу, ты гледзі свое паршы: у твоей сем’е тожэ вэлікого порадку нема*; пойці́ скрэ́дома. Адправіцца ў невядомым кірунку. *А хто знае, дзе вон блудзіць: нема цэлы дзеньнедзі пошоў скрэдома*.

Услед за “Дыялектным слоўнікам Косаўшчыны” ў 2014 годзе ў “Брэсцкай друкарні” Алесем Зайкам выдадзены “Фразеалагічны слоўнік Косаўшчыны”. Слоўнік прадстаўляе фразеалогію жыхароў паўночнай часткі Івацэвіцкага раёна. Ва ўступнай частцы аўтар адзначае, што ў слоўнік уключаны ўласнадыялектныя, агульнанародныя, літаратурныя і фальклорныя фразеалагізмы.

Слоўнікавы артыкул складаецца з загаловачнага фразеалагізма, семантычнай характарыстыкі і ілюстрацыйнага матэрыялу.

Смантычная значэнне фразеалагізмаў падаецца шляхам апісання сэнсу, падбору слова-адпаведніка ці словазлучэння : браць (узя́ць) бо́га за бараду́. Скажуць пра таго, хто лічыць сябе вышэй за другіх. *Стаў начаьнікам, думаў, шчо Бога за бараду ўзяў, людзям спуску ні даваў. Але і яго зволілі: краў муку ў калхозі*. Аўсто Стайк.; га́ньбу даць. Зганьбаваць. *Такую цялушачку спраўную купіла, а то ж мужык ганьбу даў, кажа, малая*. Бялавічы Квас.; звалі́цца як ты́чка. Раптоўна памерці. *Ажно дзіво: быў здаровы, харошы, і, бач, зваліўся як тычка*. Альшаніца Квас. Аднак ёсць і такія апісанні значэння: каб пу́сто было́. *Так скажуць, калі моцна гневаюцца на некага*; каб на яго (яе, іх) ко́ла вада́ ішла́. *Так кажуць пра чалавека, які імкнецца ўсіх падпарадкаваць сабе, навязвае сваю волю*.

Неадназначныя па структуры фразеалагізмы (ці фразеалагізмы?) наступнай будовы: нос – бог сямяры́м нёс, ды аднаму́ даста́ўся. Вельмі вялікі. *Але, братко, і нос у цябе: Бог скмярым нёс, ды аднаму табе дастаўся*. г. Івацэвічы; сёя тоя. Мала, што папала пад руку. *Пасварылася з мужыком, то сёя тоя з адзежы ўзяла ды вярнулася да бацькоў*. Альшаніца Квас.; у я́блыка. Так кажуць пра каня з цёмнымі круглымі плямамі. *Па разнарадцы далі ў наш калхоз жарабца. Орліком назвалі. Высокі, танклявы, у яблыка*. Заполле Кос.; хадзі́ць у адве́дкі. Праведваць парадзіку. *У адведкі ходзяць жанчыны. Нясуць падарункі парадзісі і дзіцяці*. Старажоўшчына Кос.; хто ў плот, хто ў агарод. Нядружна, несуладна. Хор у сяле арганізавалі. Як сталі першы раз спяваць , то хто ў плот, хто ў агарод. Заполле Кос.

Устойлівыя адзінкі тыпу *рукою падаць* і *як рукою падаць* падаюцца ў розных слоўнікавых артыкулах, хоць маюць аднолькавае значэнне ‘блізка’, што падкрэслівае і ілюстрацыйны матэрыял.

Крыніцазнаўства фразеалогіі мовы Брэсцка-Пінскага Палесся

1. Аляксейчык, Л.Г. У фразеалагічны слоўнік Брэстчыны / Л.Г. Аляксейчык, У.У Барысюк // Рэгіянальныя асаблівасці Берасцейска-Пінскага Палесся ў мове, фальклоры і літаратуры : матэрыялы Рэсп. навук. канф., г. Брэст, 9–10 лістапада 1994 г. / рэд. А.А. Майсейчык. – Брэст : Брэстдзяржпедінстытут, 1994. – С. 46.
2. Аляхновіч, М.М. Лексіка і фразеалогія Брэсцка-Пінскіх гаворак у навуковых даследаваннях / М.М. Аляхновіч, Т.М. Кананенка // Рэгіянальныя асаблівасці Берасцейска-Пінскага Палесся ў мове, фальклоры і літаратуры :

матэрыялы. Рэсп. навук. канф., г. Брэст, 9–10 ліст. 1994 г. / рэд. А.А. Майсейчык. – Брэст : Брэстдзяржпедінстытут, 1994. – С. 47–51.

3. Аляхновіч, М.М. Устойлівыя адзінкі Брэсцка-Пінскага Палесся ў агульнамоўным кантэксце / М.М. Аляхновіч // Рэгіянальныя асаблівасці Берасцейска-Пінскага Палесся ў мове, фальклоры і літаратуры : матэрыялы. Рэсп. навук. канф., г. Брэст, 9–10 ліст. 1994 г. / рэд. А.А. Майсейчык. – Брэст : Брэстдзяржпедінстытут, 1994. – С. 52–53.

4. Аляхновіч, М.М. Фразеалагічны слоўнік Брэсцка-Пінскага Палесся / М.М. Аляхновіч // Праблемы народнай адукацыі, навукі, культуры Беларускага Палесся : у 2 ч. – Ч. 1. – Мазыр, 1992. – С. 6–8.

5. Аляхновіч, М.М. Характарыстычнасць як адна з семантычных адзінак дыялектных фразеалагізмаў / М.М. Аляхновіч // Дыялекталогія і культура беларускай мовы : тэз. Дакл. Рэсп. навук.-практ. канф. – Мінск, 1991. – С. 6–10.

6. Барысюк, У.У. З гаворкі вёскі Альшаны Столінскага раёна / У.У. Барысюк, Н.М. Буян // Рэгіянальныя асаблівасці Берасцейска-Пінскага Палесся ў мове, фальклоры і літаратуры : матэрыялы Рэсп. навук. канф., г. Брэст, 9–10 ліст. 1994 г. / рэд. А.А. Майсейчык. – Брэст : Брэстдзяржпедінстытут, 1994. – С. 57–60.

7. Дыялектны слоўнік Брэстчыны / склад. М.М. Аляхновіч [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 294 с.

8. Емельяновіч, В.М. Фразеалагізмы ацэнкі ў гаворках Берасцейчыны / В.М. Емельяновіч // Дыялекталогія і культура беларускай мовы : тэз. Рэсп. навук.-практ. канф. – Мінск, 1991. – С. 52–55.

9. Зайка, А. Фразеалагічны слоўнік Косаўшчыны / А. Зайка. – Брэст : Брэсцкая друкарня, 2014. – 308 с.

10. Касцючык В.М. Выкарыстанне дыялектных фразеалагізмаў у навучальным працэсе як фактар далучэння моладзі да нацыянальнай культуры / В.М. Касцючык // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. Філал. навукі, літаратуразнаўства, мовазнаўства. – 2006. – № 2. – С. 92–95.

11. Касцючык, В.М. Аказіянальныя субстытуцыі ў структуры дыялектных фразеалагічных варыянтаў / В.М. Касцючык // Вучоныя запіскі Брэсц. дзярж. ун-та імя А.С. Пушкіна : зб. навук. прац : у 2 т. – 2006. – Т. 2 – С. 30–37.

12. Касцючык, В.М. Варыянтнасць у дыялектнай фразеалогіі (На аснове гаворак беларуска-ўкраінскага памежжа) / В.М. Касцючык // Мовы Вялікага Княства Літоўскага : матэрыялы IV Міжнар. навук. канф., 18–19 мая 2004 г. / рэд. М.М. Аляхновіч. – Брэст : Академия, 2005. – С. 182–184.

13. Касцючык, В.М. З назіранняў над міждыялектнай варыянтнасцю ФА / В.М. Касцючык, А. Казловіч // Рэгіянальныя асаблівасці Берасцейска-Пінскага Палесся ў мове, фальклоры і літаратуры : матэрыялы Рэсп. навук. канф., г. Брэст, 9–10 ліст. 1994 г. / рэд. А.А. Майсейчык. – Брэст : Брэстдзяржпедінстытут, 1994. – С. 81–84.

14. Касцючык, В.М. Пра адзін тып вар’іравання фразеалагізмаў у гаворках Берасцейшыны / В.М. Касцючык // Загароддзе-2 : матэрыялы навук.-краязн. канф. “Палессе – скрыжаванне культур і часу”, г. Пінск, 25–27

верасня 1999 г. / агул. рэд. Ф.Д. Клімчук, В.А. Лабачэўская. – Мінск : Навука і тэхніка, 2000. – С. 129–132.

15. Касцючык, В.М. Рэгіянальныя асаблівасці фразеалагізмаў Брэсцка-Пінскага Палесся / В.М. Касцючык // Рэгіянальныя асаблівасці Берасцейска-Пінскага Палесся ў мове, фальклоры і літаратуры : матэр. Рэспубл. навук. канф., 9–10 лістапада 1994 г. / рэд. А.А. Майсейчык. – Брэст : Брэстдзяржпедінстытут, 1994. – С. 84–87.

16. Касцючык, В.М. Семантычна тоесныя фразеалагічныя сінонімы (на матэрыяле гаворак Берасцейшыны) / В.М. Касцючык // Святло сакавіцкага слова : навук. выд. да 60-х угодкаў прафесара Галіны Мікалаеўны Малажай / рэд. М.М. Аляхновіч. – Брэст : БрДУ, 1998. – С. 249–258.

17. Касцючык, В.М. Сказана – звязана : матэрыялы да рэгіянальнага слоўніка Брэстчыны / В.М. Касцючык ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ, 2013. – 71 с.

18. Клундук, С.С. Слова да слова – будзе мова : дыялектны слоўнік в. Фядоры / С.С. Клундук ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ, 2010. – 100 с.

19. Малажай, Г.М. Адлюстраванне народнай маралі ў ацэначных словах і фразеалагізмах Брэсцка-Пінскага Палесся / Г.М. Малажай // Рэгіянальныя асаблівасці Берасцейска-Пінскага Палесся ў мове, фальклоры і літаратуры : матэрыялы Рэсп. навук. канф., г. Брэст, 9–10 ліст. 1994 г. / рэд. А.А. Майсейчык. – Брэст : Брэстдзяржпедінстытут, 1994. – С. 89–92.

20. Пашкевіч, М.І. Рубельскі лексіка-фразеалагічны слоўнік / М.І. Пашкевіч ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ, 2008. – 66 с.